Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 2 (280) | 18 студзеня 1957 года | Цана 20 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Ідуць экзамены і залікі

Насустрач выбарам

Новыя правілы правапісу

Палепшыць работу гурткоў

НА ЗДЫМКУ: кандыдат фізіка-матэматычных навук Анатолій Сямёнавіч Феозенка ставіць у экзаменацыйную ведамасць супроць прозвішча Фані Гінзбург «выдатна».

Фота П. БЕРАЖКОВА.

Дружнай сям'ёй

Сесія ідзе. Работы у студэнтаў многа. Асабліва хвалююцца зараз першакурснікі. Яны ва увесь голас абвясцяць, для чаго паступілі ва універсітэт, на што яны здольны, зададуць тон на усе наступныя гады вучобы.

Першы курс аддзялення фізікі прысвяціў пытанню вучобы комсамольскі сход, на які былі запрошаны студэнты старэйшых курсаў.

Важнае пытанне! І трэба было чакаць, што першакурснікі з ахвотай паслухаюць карысныя парады больш вопытных. Але на сход прышло меньш палавіны першакурснікаў. Давялося перанесці яго на іншы дзень. Прауда, на гэты раз збор аказауся лепшым. Але здзіўленне выклікала тое, што першакурснікі не ведалі, аб чым гаварыць. А пагаварыць было аб чым.

Як адзначыла у сваім дакладзе сакратар комсамольскага бюро курса Зоя Ярошына, многія комсамольцы нядобрасумленна адносяцца да сваіх абавязкаў. Студэнты Гамеза і Сіуцоў дрэнна здаюць пазааудыторнае чытанне па замежнай мове. Староста другой групы Караулава, карыстаючыся тым, што уласных пропускаў можна не адзначаць у журнале наведвання заняткаў, вельмі рэдка паяуляецца ў аудыторыі. Па яе прыкладу дзейнічае і групорг.

Ды не толькі гэта павінна хваляваць комсамольцаў. Справа у тым, што многія не ведаюць, як добра падрыхтавацца да экзаменаў, за што брацца, з чаго пачынаць. Карыснымі ў гэтых адносінах былі выступленні выкладчыка М. Я. Рэзнікава, студэнтаў старэйшых курсаў Вайтовіча і Цярпігор'евай.

— У першую чаргу вам патрэбна умацаваць калектыу,—сказаў т. Вайтовіч.—Толькі тады вы здолееце дасягнуць добрых поспехаў, калі будзеце працаваць дружна, дапамагаць адзін аднаму.

Далей ён рэкамендуе болып працаваць самастойна, лепш рыхтавацца да лекцый і практычных заняткаў, рабіць так, каб наступная лекцыя не была механічнай рэгістрацыяй таго, што гаворыць выкладчык, а станавілася асэнсаваным творчым працэсам.

Толькі тады можна зауважыць лагічную сувязь паміж лекцыямі,

—гару звернеш

правільна зразумець выкладчыка, калі студэнт добра засвоіу мінулае і у яго маецца для гэтага неабходная база ведаў.

Не менш цікавым было і выступленне Н. Цярпігор'евай. Яна звярнула увагу на тое, што курс працуе не дружна, многія нават не ведаюць адзін другога па прозвішчу.

— Дружнай сям'ёй гару можна звярнуць,—сказала яна,—а у вас абыякава адносяцца да стварэння калектыву, у якім давядзецца вам жыць і працаваць да канца навучання ва універсітэце.

Яна прапануе працаваць над кнігай невялікімі групамі па 2—3 чалавекі: што незразумела аднаму, дапаможа разабрацца другі, пропускі у канспекце могуць быць дапоунены запісамі таварышаў. А хто будзе працаваць самастойна, той абавязкова павінен высветліць усё незразумелае у сваіх аднакурснікаў, у студэнтаў старэйшых курсаў ці выкладчыкаў. Усё гэта дапаможа добра здаць экзамены, дабіцца таго, каб увесь курс здаў сесію без дрэнных і нават пасрэдных адзнак.

Выступіушы ў заключэнне М. Я. Рэзнікаў звярнуу увагу студэнтаў на неабходнасць самастойнай працы над кнігай, заклікаў неадкладна брацца за справу, настойліва рыхтавацца да сесіі, каб на экзаменах атрымаць толькі добрыя і выдатныя адзнакі.

С. ШЧЭРБА.

ЭКЗАМЕНЫ І ЭКЗАМЕНАТАРЫ

Экзаменацыйная сесія з'яуляецца важнай падзеяй у жыцці навучальнай установы. Асабліва вялікае значэнне мае прадстаячая зімняя сесія, якая павінна прайсці пад знакам высокай патрабавальнасці. У час экзаменаў неабходна сур'ёзна праверыць і аб'ектыуна ацаніць веды кожнага студэнта, па-сапраўднаму высветліць, хто са студэнтаў займаўся, працаваў на працягу усяго семестра, а хто нічога не рабіу, разлічваючы як-небудзь праскочыць на экзаменах. Гэта дапаможа вызваліцца ад несур'ёзных студэнтаў і павысіць якасць вучобы.

Да апошняга часу існавау такі парадак назначэння стыпендый, пры якім здавальняючая адзнака ва усіх выпадках пазбаўляла студэнта стыпендыі. А многія-ж у ёй мелі вострую патрэбу. Натуральна, што якім-бы строгім і патрабавальным не быу той або іншы выкладчык, ён паступова паддаваўся агульнаму настрою і адступаў ад сваіх пазіцый. Акрамя таго экзаменатар, у якога у экзаменацыйнай ведамасці сустракаліся лішнія здавальняючыя або нездавальняючыя адзнакі, пярэдка падвяргауся неабгрунтаваным нападкам, ставілася пад сумненне якасць яго выкладання. Усё гэта ведалі і добра ўлічвалі адсталыя студэнты, якія каля дзвярэй экаменатара размаўлялі прыкладна так: «Калі ён сёння паставіу ужо дзве або тры здавальняючых адзнакі, то можна смела заходзіць—ён іх больш ставіць не будзе. Ліміт, мауляу, вычарпан». Нажаль, такія размовы не пазбаўлены былі пэуных падстаў. Прауда, ніхто ніякага ліміту экзаменатарам ніколі не ўстанауліваў, але сам экзаменатар не забываў весці улік пасрэдных адзнак.

Баючыся наклікаць на сябе непрыемнасць і не жадаючы псаваць адносін са студэнтамі, некаторыя выкладчыкі станавіліся на шлях агульнага зніжэння патрабаванняу пры ацэньванні ведаў у час экзаменаў. Такія «мяккасардэчныя» экзаменатары забывалі аб той простай ісціне, што высокаи патрабавальнасці баіцца толькі той студэнт, які шукае ў ВНУ лёгкага, бесклапотнага жыцця.

Сказанае намі не магло не выклікаць у некаторых студэнтаў лёгкіх адносін да навукі. Асобныя юнакі і дзяўчаты, якія без усялякіх цяжкасцей перайшлі са школьнай скамі ў студэнцкую аудыторыю, сталі ўяўляць, што робяць нейкую паслугу адным сваім знаходжаннем ва універсітэце, што яны нарадзіліся толькі для таго, каб без усякіх намаганняу атрымаць дыплом ВНУ.

Недастатковая патрабавальнасць на экзаменах, урауняльны падыход да ацэнкі ведаў выклікалі законны пратэст з боку добрасумленных, перадавых студэнтаў, якія складаюць большасць у нашых навучальных установах. Яны адчувалі сябе глыбока абражанымі, калі які-небудзь абібок, выхваляючыся перад таварышамі сваімі незаслужанымі адзнакамі, цынічна заяўляу: «Няхай дурні сядзяць у кабінетах і бібліятэках, а я і так здам экзамены».

Пастаянна клапоцячыся аб студэнцкай моладзі, Комуністычная партыя і Совецкі урад правялі у прайшоўшым годзе рад мерапрыемстваў, ствараючых спрыяльныя умовы для паспяховай вучобы. Адменена плата за навучанне у сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, праведзена змяненне у парадку назначэння стыпендый, значна пашырана матэрыяльная і навукова-тэхнічная база вышэйшых навучальных устаноў.

Клапоцячыся аб студэнцкай моладзі, неабходна разам з тым павышаць да яе патрабаванні. Гаворачы аб высокай патрабавальнасці, мы маем на ўвазе не толькі экзамены, але і усе іншыя віды вучэбнай работы (семінарскія заняткі, курсавыя і дыпломныя работы, вытворчая практыка і г. д.). Аднак у гэтым артыкуле нам хочацца сказаць аб экзаменах. Высокая патрабавальнасць на экзаменах не толькі забяспечвае правільную ацэнку ведау студэнтаў, але і з'яуляецца важным сродкам выхавання ў іх пачуцця адказнасці перад народам, дзяржавай.

Таму нельга далей мірыцца з такім становішчам, калі некаторыя экзаменатары, забываючы аб сваім высокім прызначэнні, робяцца нагадвающымі казачнага Дзеда-мароза, які раздае падарункі —добрыя і выдатныя адзнакі. Наступіу час поунасцю аднавіць у правах здавальняючую і наздавальняючую адзнакі.

Зусім няправільна паступаюць тыя экзаменатары, якія, жадаючы «дапамагчы» дрэнна адказваючаму студэнту, не выстаўляюць яму заслужанай адзнакі, а накіроўваць «падвучыць», каб праз некалькі гадзін зноў яго экзаменаваць. Пры гэтым другая сустрэча заўсёды заканчваецца добрым вынікам. Такога роду практыка адмоўна ўплывае на студэнтаў, абясцэньвае экзамены і прыніжае годнасць самаго экзаменатара. Лепш ужо некалькі лішніх мінут пасядзець са студэнтам, задаць яму дадатковыя пытанні, але абавязкова паставіць пэўную адзнаку.

Падкрэсліваючы ролю экзаменатараў, якія павінны адмовіцца ад шкоднага лібералізма, які наносіць вялікую шкоду інтарэсам дзяржавы, справе падрыхтоўкі высококваліфікаваных спецыялістаў, мы, аднак, не лічым, што адны толькі выкладчыкі здольны вырашыць гэтую складаную задачу забеспячэння патрабавальнасці.

Разам з тым трэба папярэдзіць ад шараханняў у другі бок, ад празмерных прэгэнзій. Патрабаванні да студэнтаў павінны быць разумнымі. Гутарка ідзе аб аб'ектыунай ацэнцы ведаў, як кажуць, без «скідак», але і без «націску».

Толькі агульнымі намаганнямі выкладчыкаў і студэнтаў можна дабіцца сур'ёзнага павышэння паспяховасці і далейшага паляпшэння усёй нашай вучэбна-выхаваўчай работы.

Дацэнт **Б. БАБІЦКІ.**

ЯШЧЭ АДНА СТУПЕНЬКА

Прыбіральшчыца яшчэ не паспела закончыць сваю работу, а ужо група дзяучат сабралася у цесны круг, і, нервова перагортваючы старонкі падручнікаў, звярталіся адна да другой з пытаннямі. Ёсць яшчэ незразумелае, а часу няма—экзамен пачауся.

Студэнты другой групы IV курса аддзялення матэматыкі, рыхтуючыся да экзамена па асновах геаметрыі, яшчэ напярэдадні кідалі «жараб'ёку», каму якім нумарам здаваць. І вось першыя ўжо у аудыторыі.

Хоць свая чарга яшчэ далека, Аля Гайко з самай раніцы ужо з сяброукамі тут. Ды і як стрымацца—першы экзамен у гэтым годзе.

Вельмі доўга цягнуцца мінуты, і, забыушыся на сваю сталасць (усё-ж чацверты курс), балельшчыкі па-дзіцячаму узбуджана пазіраюць праз замочную шчыліну. А минуты ідуць, марудныя мінуты...

Раптам дзверы адчыніліся, і на парозе, трымаючы раскрытай заліковую кніжку, паказваецца Рыма Мядзведзева. Шчасливая усмешка, бадзёры настрой без слоу гаварыл: «выдатна». Затым выйшла Рыта Ярымовіч: таксама з выдатнай адзнакай.

Чацверакурснікі—народ бывалы, не ўпершыню ім здаваць экзамены. А усё-ж глядзі, хваляванне можа выдаць цябе, не стрымаешся. Вось і зараз Ліля Мялешка, чакаючы сваёй чаргі, моцна хвалюецца. Але і тут сяброукі не пакідаюць яе. Бадзёрае, чулае слова—а колькі яно значыць! І калі Ліля, выйшаўшы ад экзаменатара сказала «добра», усе з палёгкай уздыхнулі.

Нарэшце экзамен закончыуся, і у заліковых кніжках з'явілася яшчэ адна адзнака—тая ступенька, узняушыся на якую студэнт набліжаецца да сваёй запаветнай мэты. З 25 здаваушых 8 атрымала «выдатна», 13—«добра» і толькі 4—«здавальняюча».

Ф. САВІЦКІ.

Насустрач выбарам у мясцовыя Советы

Партыйны камітэт і пярвічныя партыйныя арганізацыі універсітэта прараблі вялікую арганізацыйную работу па разгортванню масава-палітычнай работы сярод выбаршчыкаў. Вылучана з ліку комуністаў і комсамольцаў каля 200 агітатараў, якія маюць значны вопыт у агітацыйнай рабоце. Партыйны камітэт правёу семінар агітатараў, на якім абмяркоувалися задачы агітацыйна-прапагандысцкай работы. Значную ролю у сувязі з гэтым павінен адыграць агітпункт. Ён павінен быць цэнтрам палітычнай работы на участку. Ужо зараз агітпункт пры універсітэце разгарнуў сваю дзейнасць, згуртаваў шырокі актыу. Пры ім арганізавана дзяжурства агітатараў, маецца стол даведак, неабходная колькасць літаратуры, часопісы, газеты. У плане работы агітпункта прадугледжана чытанне лекцый і дакладаў на розныя тэмы, сустрэчы са знатнымі людзьмі, дэпутатамі, правядзенне вечароў самадзейнасці, кіно, кансультацый па розных пытаннях і г. д.

Галоўная задача агітпункта і яго калектыву—забяспечыць высокую дзейнасць перадвыбарчай палітычнай агітацыі.

Кожная гутарка агітатара, палітычны даклад і кансультацыя на агітпункце павінны быць цесна звязаны з чарговымі задачамі дня па ператварэнню ў жыццё рашэнняу XX з'езда партыі і снежаньскага Пленума ЦК КПСС.

А. ЗЮБА.

НА ЗДЫМКУ: лабарант кабінета гісторыі КПСС А. Ф. Малчанаў і старэйшы лабарант кабінета палітэканоміі Н. А. Яравікоў у агітпункце складаюць спісы выбаршчыкаў.

Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

УРАЖАННЕ ВЫКЛАДЧЫКА

Студэнты II курса аддз. матэматыкі здавалі залік па дыферэнцыяльнай геаметрыі. Студэнты курса сістэматычна наведвалі практычныя заняткі на працягу усяго семестра, акуратна канспектавалі першакрыніцы. У выніку гэтага студэнты прыйшлі да заліку добра падрыхтаванымі і здалі яго паспяхова. Добрыя тэарэтычныя веды і уменее рашаць практычныя задачы паказалі студэнты Л. Кудзін, І. Эпштэйн, Д. Шчарбінская, Р. Усава, М. Мулярчык і другія.

Выключэнне саставіу студэнт 4-ай групы Л. Левіцін. Прапанаваную яму задачу ён рашыць не змог. Прасядзеушы звыш гадзіны ў аудыторыі ён вярнуу лісток, на якім было запісана заданне, сказаўшы пры гэтым: «Сёння я здаваць не буду».

Такі вынік не з'яуляецца выпадковым. Левіцін рэдка наведваў практычныя заняткі, не заусёды рыхтаваўся да іх.

А. ГУСАК,
кандыдат фізіка-матэматычных навук.

У чытальнай зале не знойдзеш ніводнага свабоднага месца. Усе студэнты заняты зараз падрыхтоўкай да экзаменаў. Студэнт-гісторык, паважна ускінуўшы на зморшчаны лоб акуляры, глядзіць некуды удалячынь, летуценна уносячыся ў сівыя вякі старажытнай Эллады. На некалькі мінут захапіўся любімай паэзіяй лепшы дэкламатар філфака Тамара Пашкевіч. Яна разам са сваімі аднакурсніцамі Аняй Корсак і Лідай Ступаковай рыхтуецца да практычных заняткаў па гістарычнай граматыцы. Прачытаўшы главу, можна і адпачыць, пацікавіцца выдатным зборнікам «Дзень паэзіі». Бо нельга-ж забываць і аб фестывалю, трэба рыхтавацца да яго.

НА ЗДЫМКУ: Студэнты філфака Тамара Пашкевіч, Аня Корсак і Лідзія Ступакова рыхтуюцца да практычных заняткаў.

Першыя вынікі

— Вы падрыхтуеце пытанне аб эканамічных укладах у пераходны перыяд у Кітаі,—звяртаецца Іван Ціхановіч Васілеускі да студэнткі IV курса аддзялення фізікі Ніны Цярпігор'евай.

Выкладчык ведае Ніну, як старанную добрасумленную студэнтку, якая заусёды грунтоўна рыхтавалася да семінарскіх заняткаў. Добры, змястоўны адказ дзяўчыны і на гэты раз парадаваў выкладчыка.

Не мніш грунтоўным і глыбокім быў адказ і студэнта Артура Пракапчука.

Марыеце Волк-Левановіч, Эме Івашкевіч, Людміле Сарока і Вячэславу Смоліку залік быў пастаулены адразу. Усе яны актыўна выступалі на кожным семінары і паказвалі пры гэтым добрыя веды па асноўных эканамічных пытаннях.

Але не усе студэнты групы оптыкі і тэарэтыкі добра падрыхтаваліся да заліку. Аркадзій Рудой атрымаў здавальняючую адзнаку.

— Рудой—здольны студэнт,—гаворыць выкладчык.—Але калі-б ён наведваў семінарскія заняткі, то і да заліку падыйшоўбы лепш падрыхтаваным.

Адказы Адама Зыля і Леаніда Матруховіча таксама пакінулі непрыемнае уражанне.

— Аднак агульныя вынікі заліку,—гаворыць Іван Ціханавіч,—добрыя.—Трэба сказаць, што асабліва добра адказвалі тыя студэнты, якія заусёды старанна рыхтаваліся да семінарскіх заняткаў.

О. СЦЕПАНЕНКА.

БЛІЖЭЙ да СТУДЭНТАЎ

Нядауна адбыуся вучоны совет гуманітарных навук універсітэта, на якім было абмеркавана пытанне аб удзеле прафесарска-выкладчыцкага саставу юрыдычнага факультэта у палітыка-выхаваўчай рабоце сярод студэнтау.

У сваім дакладзе т. Меркушау падкрэсліу, што большасць выкладчыкау факультэта ў лекцыях і на семінарскіх занятках спалучаюць выхаванне і адукацыю, надаюць ужытым фактам палітычную завостранасць, мэтанакіраванасць.

Тым не менш, як адзначыу дакладчык, нельга абмяжоуваць выхаванне рамкамі вучэбнага плана. Выкладчыкі павінны бываць у студэнцкіх інтэрнатах, месцах адпачынку, бібліятэках, чытальных залах, выступаць арганізатарамі экскурсій. Хто, як не выкладчык, дапаможа скласці правільны расклад дня, дасць параду, як лепш падрыхтавацца да семінарскіх заняткаў, высветліць тое або іншае пытанне?

Партыйная арганізацыя і дэканат факультэта замацавалі за вучэбнымі групамі 15 лепшых выкладчыкаў.

Малады выкладчык кафедры гісторыі КПСС Н. П. Хрыпко працуе у другой групе II курса. Перш чым правесці якое-небудзь мерапрыемства, Надзежда Паулауна гутарыць са студэнтамі, раіцца з актывам. Яна зауважыла аднойчы, што да пытанняу міжнароднага і унутранага становішча у студэнтау асаблівая цікавасць. Грунтоуна падрыхтаваушыся, т. Хрыпко правяла ў групе палітінфармацыю. Пасля гэтага былі абмеркаваны некаторыя праблемныя артыкулы маладзёжных часопісау. З вялікай цікавасцю абмеркавала, напрыклад, група выніки XVI алімпійскіх гульняу, правяла вечар адпачынку, на якім выступілі аматары мастацкай самадзейнасці.

Усе гэтыя мерапрыемствы прывялі да таго, што у групе узнік моцны калектыу, палепшылася паспяховасць і дысцыпліна.

Часта бывае у студэнтау першай групы III курса К. А. Барзова. Разам з актывам яна правяла рэйд праверкі самастойнай работы студэнтау, прагледзела канспектаванне першакрыніц, азнаёмілася з умовамі быту. Жыва і цікава праводзяць палітінфармацыі тт. Шавельская, Мельцэр

Было-б добра, каб такую адказнасць адчувалі усе таварышы, вылучаныя для работы у групах. Але гэтага, на вялікі жаль, пакуль што нельга сказаць. Так, напрыклад, камісія, якая праверыла выхаваучую работу выкладчыкау юрыдычнага факультэта, паведаміла, што некаторыя таварышы не праводзяць палітыка-выхаваучай работы у групах і фармальна адносяцца да гэтага даручэння. Да такіх у першую чаргу неабходна аднесці тов. Р. І. Рэцкага (I група II курс), Н. А. Кудзінава (II група I курс). Як вынік, у вышэй памянёных групах не назіраецца неабходнай напружанасці у вучобе, маюць месца частыя пропускі лекцый.

Асноуную адказнасць за становішча палітыка-выхаваучай работы на факультэце нясуць партыйная і комсамольская арганізацыі, а таксама дэканат.

Ад таго, як яны будуць дапамагаць прапагандыстам і агітатарам, абагульняць вопыт работы лепшых груп,—залежыць поспех справы.

А між тым, трэба сказаць, што ў кіраўніцтве палітыка-выхаваучай работай не зжыт яшчэ фармалізм.

Мала замацаваць таго або іншага выкладчыка за групай. Трэба даць яму карысны інструктаж, параіць, з чаго лепш пачаць работу. Асабліва гэта датычыцца маладых таварышаў, якія нядауна сталі выхавацелямі.

Зусім справядлівай трэба прызнаць крытыку у адрас дэканата з боку Ніны Аляксандрауны Новасёлавай, якая заявіла на вучоным совеце:

— Аб тым, што мяне замацавалі за групай я даведалася, калі прачытала спіс, вывешаны на дзвярах дэканата. Што я павінна рабіць сярод студэнтау, аб гэтым са мной ніхто не пагаварыу. А вельмі хацелася-б атрымаць добрую параду, перыядычна абменьвацца вопытам работы.

Памыляюцца тыя агітатары, якія захапляюцца колькасным бокам, імкнуцца правесці больш гутарак, дакладау, вечароу і экскурсій. А аб якасці мерапрыемстваў яны забываюць.

Галоуным крытэрыям ацэнкі работы выхавацеля будзе вучоба, дысцыпліна, маральны воблік калектыву.

Быць бліжэй да студэнцкай масы, дапамагчы ёй цвёрда засвоіць дыялектыка-матэрыялістычны светапогляд, прынцыпы комуністычнай маралі і вызваліцца ад усяго аджыўшага і шкоднага—пачэсны абавязак прафесарска-выкладчыцкага саставу юрыдычнага факультэта.

А. МАЛАШКА.

З рэдакцыйнай пошты

БОЛЬШ ГАСПАДАРЛІВАСЦІ

На першым паверсе інтэрната у корпусе «А» ёсць умывальнік, але ён заняты камендантам пад кладавую для асабістага карыстаня. На 3-м і 4-м паверхах часта няма вады, і больш двухсот дзяучат павінны умывацца на другім паверсе.

Прарэктар па адміністрацыйна - гаспадарчай частцы т. Бярэзін і камендант інтэрната т. Давыдоускі поугода абяцаюць вызваліць умывальнік, але гэта толькі абяцанні. Некалькі разоу звярталіся мы да Б. Н. Бярэзіна, каб у інтэрнат накіравалі столяра зрабіць ва умывальніках палічкі і вешалкі для уціральнікаў і прыналежнасцяу туалета. Але уціральнікі і на сённяшні дзень даводзіцца класці на брудны падваконнік. Краны ва умывальніках таксама сапсаваныя.

Студэнтам няма месца для сушкі бялізны, хоць у інтэрнаце і ёсць свабодны прасторны паддашнік. Трэба толькі зрабіць замок. Давыдоускі абяцае зрабіць гэта ужо больш месяца.

Карацей кажучы, нашы гаспадарнікі стараюцца быць у баку ад задавальнення патрэб студэнтау. А Давыдоўскаму-ж трэба быць больш гаспадаром, чым адміністратарам.

М. ТАМКО,
В. РУДАКОЎСКІ,
Н. ЦВІРКА,
В. КУЗЬМІЦКІ,
С. ШЫЦЬКО,
З. ШЫНГЕЛЬ,
Е. СЕЛЯЎКА,
Н. ЛОСЬ.

Ці такой павінна быць аранжарэя?

Загляніце ў нашу аранжарэю і перад вамі паустане такі малюнак: шыбы выбітыя, сценкі аблупіліся, страшэнная цесната. А калі на дварэ ідзе дождж, то ідзе ён і у аранжарэі.

Шматлікія кветкі жалобна схілілі галовы, бо тэмпература вельмі высокая, а вентыляцыі няма.

Аб гэтым даўно вядома і прарэктару па адміністрацыйна - гаспадарчай частцы т. Бярэзіну і галоўнаму інжынеру т. Смоткіну, але яны чамусьці не задаюць сабе пытання: ці такой павінна быць аранжарэя?

Н. БЫВАЛЫ.

НАМ ПАТРЭБЕН КАБІНЕТ ХІМІІ

Каля сарака студэнтау I—IV курсаў хімічнага факультэта займаюцца зараз эксперыментальнай навуковай работай. Гэта рэкордная лічба за апошнія гады. Працуе тут чатыры гурткі: неарганічнай, аналітычнай, арганічнай і фізічнай хіміі. У кожным з гурткоу праведзена па 2—3 пасяджэнні, на якіх былі заслуханы даклады іх членаў аб выніках сваей работы і аб найбольш цікавых артыкулах з часопісаў.

Некаторым студэнтам ужо у гэтым семестры давялося атрымаць станоўчыя вынікі, аднак у большасці сваей падрыхтоўчы перыяд яшчэ не закончыўся. Прычынай гэтага з'явілася тое, што большасць студэнтаў-гурткоуцаў вельмі позна ўзялася за работу. Другой, і, можа быць, найбольш важнай прычынай быў недахоп рабочага месца. Асабліва дрэнна у гэтых адносінах абстаць справа на кафедрах аналітыкі і каталізу.

У двух лабараторыях кафедры аналітычнай хіміі праходзяць практыку больш двухсот студэнтау. Лабараторыі заняты з 8 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара. Калі да гэтага дадаць, што асноуным рэактывам у іх практыкуме з'яуляецца серавадарод і што выцяжныя шафы працуюць дрэнна, то можна сабе наглядна уявіць умовы работы на гэтай кафедры. Але у гэтым нельга абвінаваціць ні дэканат, ні кафедру, таму што гэтае пытанне нельга рашыць у факультэцкіх маштабах.

Ужо больш пяці год узнімаецца на нашым факультэце пытанне аб кабінеце хіміі. На ўсіх сходах аб ім гавораць студэнты і выкладчыкі, аднак далей размоу справа не ідзе. А на гэтае пытанне трэба неадкладна звярнуць увагу.

В. САЛДАТАЎ,
студэнт III курса хімфака.

Для патрэб нафтавай прамысловасці

У новым пяцігадовым плане прадугледжана будаўніцтва нафтаачышчальных заводаў у БССР. Гэта новая галіна прамысловасці у рэспубліцы. Таму перад нашымі вучонымі паустае адказная задача, у рашэнні якой яны павінны прыняць актыуны удзел.

На нядауна адбыушымся навуковым семінары хімфака былі дэталёва абмеркаваны гэтыя пытанні. З дакладамі выступілі удзельнікі Усесаюзнай нарады хімікау ВНУ па хіміі нафты прафесар Г. Л. Старобінец і дацэнт В. Ф. Беляеу.

Важнейшай задачай нафтавай прамысловасці з'яуляецца пашырэнне вытворчасці хімічных прадуктау з нафтавай сыравіны: рознастайных спіртоу, арганічных кіслот, сернай кіслаты, лакау, пластмас, штучнага валакна, мыючых сродкау і многіх іншых каштоуных прадуктау.

У сувязі з павелічэннем здабычы высокасярністай нафты паустае задача адшукання метадау яе перапрацоукі. У сучасны момант на радзе прадпрыемстваў шырока укараняецца хімічны крэкінг, каталітычнае алкіліраванне і іншыя працэсы, якія павялічваюць выхад светлых нафтапрадуктау. Але гэтага яшчэ не дастаткова. Рост парка рэактыуных рухавікоу, цеплавозаў, аутамашын і трактараў патрабуе павелічэння светлых прадуктау з нафты, таму і пашыраецца будаўніцтва новых нафтавых заводаў.

Усе новыя заводы праектуюцца, як комплексныя камбінаты па вытворчасці рознастайных відаў паліва і хімічных прадуктаў на базе перапрацоукі нафты.

У сувязі з гэтым перад хімікамі нашай краіны стаяць даволі адказныя задачы: больш глыбока даследаваць састау нафты, вывучыць металаарганічныя злучэнні, асабліва вандыя, пашырыць даследаванні механізма і кінетыкі каталітычных рэакцый, распрацаваць і удасканаліць метады атрымання паліва і маслаў для зверхгукавой авіацыі, а таксама эфектыуныя метады раздзялення складанай сумесі вуглевадародаў на больш вузкія фракцыі або асобныя вуглевадароды, павялічыць рэсурсы араматычных вуглевадародаў, асабліва бензола.

Каб паспяхова вырашыць гэтыя важныя праблемы, неабходна рыхтаваць кадры шырокага профілю, якія добра былі-б знаёмы з комплекснымі схемамі перапрацоукі нафты, асабліва па кінетыцы і каталізу.

Пасільны уклад у гэтую галіну навукі уносяць вучоныя нашага універсітэта. У сучасны момант праводзяцца работы па акісленню вуглевадародаў, удасканальваюцца механізмы кінетыкі асобных кінетычных рэакцый, падбіраюцца каталізатары.

На жаль, шырока разгарнуць работу у галіне «хімія нафты» у БДУ няма матчымасцей: нехапае лабараторый і абсталявання для іх.

Рэктарат універсітэта павінен стварыць умовы для правядзення эксперыментальных даследаванняу у гэтай галіне.

В. ЦІШКЕВІЧ.



Дзень УНІВЕРСІТЭТА

(РЭПАРТАЖ)

У перадранішняй імгле павольна гойдаюцца сняжынкі. Ярка свецяцца агні вучэбных карпусоў. Стрэлка цыферблата пераскоквае на 8. І ужо праз некалькі мінут у калідорах пануе цішыня, зрэдку перарываемая гучным абменам думкамі студэнтаў, якія здаюць залікі.

Працоўны дзень уступае у свае правы.

У нашай бібліятэцы

Усюды адчуваюцца дні сесіі, асабліва у бібліятэцы. Кал-б туды не зазірнуў, там заусёды многа народа. Патрэбы студэнтаў. навуковых работнікаў самыя рознастайныя. Але бібліятэчныя работнікі ва усім іх задавальняюць. Штодзень бібліятэка атрымоувае навінкі мастацкай, навукова-папулярнай і палітычнай літаратуры, падручнікі.

Палепшылася у гэтым годзе і забеспячэнне падручнікамі студэнтаў-завочнікаў. На набыццё літаратуры вылучана 75 000 рублёў. Узбагацiуся і замежны аддзел за лік выданняў Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

«Вялікай універсітэцкай энцыкла педыяй» называюць студэнты даведачна-бібліяграфічны аддзел. Сярод шматлікіх скрынак, палiцак, даведнікаў, летапісаў, картак З. І. Рахманчык хутка і беспамылкова знаходзіць патрэбную для наведвальніка кнігу, артыкул, або які-небудзь іншы матэрыял. Акрамя названай вамі літаратуры, яна параіць і шмат іншых кніг, аб існаванні якіх вы нават не чулі. Так і здарылася са студэнтам V курса біёлага-глебавага факультэта В. Мельнікавым. Ён і не думаў, што знойдзе тут такую каштоуную кнігу, як «Фізіка-хімічныя асновы біялогіі» Рубінштэйна. Яна вельмі спатрэбіцца яму у рабоце над дыпломнай.

Прафесар дзеліцца ўражаннямі

У канцы мінулага года у Парыжы праходзіу VI Сусветны кангрэс глебазнаўцаў. У рабоце кангрэсу прымалі удзел совецкія вучоныя, у тым лiку і вучоныя нашага універсітэта.

Удзельнік гэтага кангрэсу прафесар І. С. Лупіновіч расказаў студэнтам і выкладчыкам біёлага-глебавага факультэта аб паездцы совецкіх вучоных на VI кангрэс глебазнаўцаў.

На кангрэсе, як адзначыў т. Лупіновіч, было праслухана каля 700 дакладаў па самых рознастайных пытаннях глебазнаўства. Совецкія вучоныя зрабілі 29 дакладаў. Асаблівую цікавасць выклікалі даклады, у якіх вырашаліся такія жыццёва-важныя праблемы, як асваенне тарфяна-балотных глеб і глеб пустыні, роля мікраарганізмаў у фармаванні глеб і іншыя.

Дэлегаты кангрэсу пазнаёмілiся з пастаноукай навучання у сярэдніх і вышэйшых навучальных установах Францыі, у прыватнасці, у Сарбонскім універсітэце, школах горада Авіньёна.

Прафесар І. С. Лупіновіч расказаў аб экскурсіях, якія зрабілі совецкія вучоныя за час знаходжання у Францыі, аб французскім народзе, Парыжы і яго сусветна вядомых помніках культуры.

У якасці каментарыяў да лекцыі былі паказаны фотаграфіі і рэпрадукцыі.

Студэнты падзякавалі прафесара І. С. Лупіновіча за вельмі карысную і цікавую лекцыю.

Папулярны кабінет

У кабінеце гісторыі КПСС асаблівая цішыня. Тут, як кажуць самі студэнты, займаюцца заусёды самыя вучоныя, а, значыць, і самыя свядомыя. У кабінеце студэнты I і II курсаў узмоцнена рыхтуюцца да залікаў і экзаменаў. Любяць гэты куток і старэйшакурснікі, таму што тут утульна, ціха, можна сканцэнтравацца. Многа работы зараз у лабаранта т. Гарбалені, бо у кабінет iдуць не толькі браць кнігі, але і раіцца, што можна прачытаць па той або іншай тэме.

— 25 том твораў В. І. Ленiна?—удакладняе Іван Андрэевіч Гарбаленя,—Калі ласка!

Хутка практыка

Працоўны настрой у кабінеце геадэзіі і картаграфіі. Iдуць практычныя заняткі па геадэзіі у студэнтаў I курса геафака. Пад кіраўніцтвам выкладчыка В. М. Касцова будучыя географы вывучаюць будову тэадаліта, нівеліра, планіметра, працуюць з імі. Веды, набытыя на практычных занятках, неабходны ім для летняй практыкі, для іх будучай работы.

Аспіранты працуюць

Хто-ж з аспірантаў у гэтым годзе напіша дысертацыю? Ідзем знаёміцца з некаторымі з іх.

Аспіранты-хімікі, нібы чарадзеі, цэлымі днямі схіляюцца над колбамі, прабіркамі, мензуркамі.

Заканчвае работу над тэмай «Кінетыка ініцыраванага аутаакіслення некаторых кетонаў» аспірантка кафедры каталізу Елена Малчан. Атрыманыя назіранні вельмі каштоуны для практычных мэт. Цікавыя даследаванні вядуць і аспіранты Гілевіч, Рафальскі, Капуцкі.

„У новым годзе—новых поспехаў"

Антону Канстанцінавічу Цітку нават адпачыць некалі: столькі новых экспанатаў трэба зрабіць!

Калі іншы раз у размове Антона Канстанцінавіча Цітка—старэйшага лабаранта сістэматыкі раслін—назавуць «уладаром усяго жывёльнага свету універсітэта»,—не здзіуляйцеся. На біёлага-глебавым факультэце амаль усе экспанаты пачынаючы ад баязлівага, пакрытага пушком качаня да вялізнага касалапага мядзведзя зроблены рукамі гэтага шасцідзесяцітрохгадовага майстра. З 1925 года прайшоу ён доугі працоўны шлях ад прэпаратара да старэйшага лабаранта.

Аспірантка кафедры каталізу Елена Малчан схілілася над прыборамі: якімі будуць сённяшнія назіранні?

— На пенсію яшчэ рана ісці,— гаворыць Антон Канстанцінавіч, — хочацца яшчэ папрацаваць. Ды і змену сабе я яшчэ не вырасціу. Ёсць на прыкмеце добры хлапчына з першага курса—Лёня Шкляроу. Здольны, ужо дапамагае мне рабіць чучалы птушак, млекакормячых. Усё гэта добра. Вось толькі крыху у крыўдзе я на студэнцкі калектыу. Прапанаваў напісаць пісьмо кітабойнай флатыліі «Слава» або палярнікам, каб яны дапамаглі папоўніць нашы калекцыі. Не падтрымалі мяне, а аднаму пісаць няёмка. А днямі А. К. Ціток атрымаў пісьмо. «Новых поспехаў, вам у Новым годзе», —піша яму яго былы вучань Владкоускі.

Самая маладая секцыя

Пакуль у першай змены iдуць заняткі студэнты другой змены спяшаюцца у спартыуныя секцыі. Асобныя студэнты юрыдычнага і філалагічнага факультэтаў не задавальняюцца толькі заняткамі гімнастыкай і лыжамі. Па іх просьбе была створана група спецыялізацыі па фехтаванню. Гэта—спорт смелых, спрытных, адзін з любімых моладдзю. Секцыю фехтавання наведваюць 37 чалавек. У складзе зборнай Рыма Белякова, Лiля Кудзіна (I разрад), Давід Гарбар, Владзіслаў Кручкоу (II разрад).

— Вельмі непрыемна толькі адно,—гаворыць трэнер Б. С. Хрэнаў, —што многія студэнты рэдка наведваюць секцыю. Гэта Вязевіч, Фралоў, Саламевіч з філфака, Кручкоу, які сам з'яуляецца адказным за фізкультурную работу ад камітэта комсамола. Яны парушаюць агульны рытм работы.

Добрым падмацаваннем для секцыі з'яуляецца і група навічкоу. Анатоль Сілкін, Ігар Раманчук ужо уключаны у зборную універсітэта. Члены секцыі зараз узмоцнена рыхтуюцца да першынства ВНУ рэспублікі, якое адбудзецца у лютым 1957 года.

* * *

Гэта толькі невялічкі куток жыцця нашага універсітэта. Новы дзень у нас багаты, знамянальны чым-небудзь. Ён прыносіць многа новых ведаў, нараджае новыя думкі, новыя імкненні.

Г. ГАЛКОЎСКАЯ,
Г. ІВАНОВА.
М. ПІЛЬШЧЫКАЎ.



Вячэслаў Мельнікаў задаволены—патрэбная кніга знойдзена!



Практычныя заняткі у географаў-першакурснікаў праходзяць цікава.

Неяк вечарам, калі я маляваў карыкатуры для нашай газеты, да мяне зайшоў сусед Арык Гусеў, вучань 4 класа.

— Давайце я вам дапамагу рысаваць,—прапанаваў Арык.

—А ты хіба умееш?—здзівіўся я.

— Зразумела! — у голасе хлапчука адчуваліся ноткі гонару. Я нават для нашай насценнай газеты рысую.

— Ну што-ж,—сказаў я.— вось табе пяць тэм, зрабі па іх малюнкі.

На наступны дзень Арык прынёс мне пяць карыкатур.

Зроблены яны былі нядрэнна і таму я рашыў апублікаваць іх.

А. КІЙРАНЕН.

Студэнт II курса аддзялення фізікі Камароў не дапушчаны да экзаменаў, таму што у яго «хвост».

А Г. Каралёў (IV курс аддзялення журналістыкі) у час абрэзаў «хвасты», таму яго і дапусцілі да экзаменаў.

Т. Андрэенка, студэнт IV курса юрыдычнага факультэта, двойчы у гэтую сесію «пасклізнуўся» на экзаменах.

Б. Хлынцаў, студэнт IV курса аддзялення журналістыкі, «засыпаўся» на заліку па палітэканоміі.



У дзень здачы заліка па гісторыі КПСС В. Смажэўская (I курс юрфака) «пагарэла» на шпаргалках.

АЖЫВІЦЬ РАБОТУ ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫХ ГУРТКОЎ

У сувязі з арыентацыяй на максімальную самастойнасць у рабоце студэнтаў вялікае значэнне набываюць навуковыя гурткі. Возьмем, напрыклад, літаратураведчыя гурткі. Кожны іх член павінен навучыцца на аснове прынцыпаў марксісцка-ленінскай эстэтыкі самастойна аналізаваць мастацкія творы, выпрацоваць уласны літаратурны густ, правільна вылучаць мастацкія сродкі і вартасць твора.

У нашых літаратураведчых гуртках павінна выспяваць зерне самастойнага мыслення, высокага эстэтычнага густу. Студэнт павінен навучыцца выступаць з юбілейным дакладам, з крытычным артыкулам ці рэцэнзіяй у друку.

Практыка паказвае, што найбольшую цікавасць выклікае ў студэнтаў напісанне крытычных артыкулаў і рэцэнзаванне літаратурных навінак. Ні для каго не сакрэт, чаму найбольшую увагу у гуртках займаюць пытанні сучаснай літаратуры. Улічваючы гэта была падабрана тэматыка для дакладаў у гуртках. Так, напрыклад, па зарубежнай літаратуры будзе зроблен агляд апошніх нумароў часопіса «Иностранная литература» і водгукаў, выкліканых выступленнем М. Шолахава, рыхтуецца даклад аб Н. Хікмеце і рэцэнзія на кнігу Іва Мантана; у гуртку па совецкай літаратуры будзе распрацоўвацца тэма «Эвалюцыя вобраза «Поднятой целины» у другой кнізе рамана М. Шолахава», «Совецкая байка у 1956 годзе». Плануецца напісаць некалькі рэцэнзій на творы, якія выйшлі у 1956 годзе. Сіламі гуртка класічнай рускай літаратуры будуць напісаны рэцэнзіі на выходзячыя у свет крытычныя работы, напрыклад, «Дастаеускі у крытыцы» і г. д.

Пульс сучаснага жыцця у яго рэволюцыйным развіцці і увасабленне яго у мастацкіх вобразах— вось аб чым жадаюць размауляць студэнты у гуртках. Таму невыпадкова цікавай атрымалася работа студэнткі Усціменка, якая напісала яе на падставе сабраных на заводах фальклорных запісаў.

Заслугоўвае пахвалы работа гуртка па беларускай літаратуры. Яго пасяджэнні праводзяцца з удзелам беларускіх пісьменнікаў. Гэта уносіць у заняткі свежы струмень, робіць іх цікавымі, выклікае актыунасць удзельнікаў.

Важнае месца у рабоце гуртку павінна заняць развіццё у студэнтаў крытычнай думкі і даследчага гарэння. У гэтых адносінах выключную ролю мае пастаноука перад гурткоуцамі новых тэм, не распрацаваных літаратурнай крытыкай. Напрыклад, вялікую увагу членаў СНТ прыцягнулі такія пытанні, як «Барбюс аб пісьмах В. І. Леніна да сваякоў» (гурток зарубежнай літаратуры); «Тэма працы у спадчыне Некрасава, Блока, Брусава» (гурток рускай літаратуры); «Сатыра Ільфа і Петрова» (гурток совецкай літаратуры) і іншыя.

Практыка паказала, што найбольшай арыгінальнасцю вылучаюцца тыя работы, тэмы якіх высунуты і аблюбаваны самімі студэнтамі. Напрыклад, у гуртку совецкай літаратуры студэнт Лапцёнак прапанаваў сваю тэму: «Камічнае у совецкай драматургіі». На мінулым аглядзе студэнцкіх навуковых работ многія працы студэнтаў, якія самастойна абіралі тэмы, атрымалі першую катэгорыю. Некаторыя з гэтых работ былі дапрацаваны і прадстаулены многімі гурткоуцамі, як дыпломныя. Напрыклад работы Дзелендзік «Твардоускі і народная творчасць» (гурток фалфклора), Гжондзеля—«Сатырычныя вобразы ворагаў міру у творах Эренбурга (гурток совецкай літаратуры) і іншыя. Тэрмін выкананя такой работы рауняецца, прыкладна, 2—3 гадам.

Трэба вітаць студэнтаў, якія з першага курса пачынаюць удзельнічаць у навуковых гуртках. А такіх многа. Сёлета, напрыклад, многія з першакурснікаў выявілі схільнасці і жаданне да навуковай работы.

У літаратуразнаучых гуртках студэнты павінны шліфаваць сваю гутаркавую мову. Навуковы даклад, напісаны без кампеляцый, самастойна і на правільнай літаратурнай мове—вось узнагарода студэнту і паказчык набытых ім ведаў.

Нажаль, у рабоце гуртку літаратурнай спадчыны ёсць яшчэ буйныя недахопы. Адзін з іх— гэта доугая раскачка. Як правіла, асноуная частка дакладау робіцца у другім семестры, а у першым справа абмяжоуваецца падборам літаратуры, кансультацыямі, размеркаваннем тэм. У гэтым вінаваты кіраунікі гурткоу, якія несвоечасова падбіраюць тэмы, а таксама мала патрабуюць ад удзельнікаў гуртка.

Другі недахоп—замкнёнасць у рабоце гурткоу. Вынікі работы СНТ рэдка становяцца здабыткам студэнцкай грамадскасці, нідзе не публікуюцца. Нядрнна было-б друкаваць рэцэнзіі на літаратурныя навінкі, ці нататкі з літаратурнага мінулага, ва універсітэцкім друку.

Вельмі карысна было-б добра выкананыя навуковыя работы захвочваць праз прафком, камітэт ЛКСМБ, рэктарат.

Кіраунікі гурткоу студэнцкага навуковага таварыства павінны значна ажывіць сваю работу, зрабіць яе змястоунай і цікавай. СНТ—гэта кузня папярэдняга адбору і падрыхтоукі навуковых кадрау нашай краіны.

Н. БАГАЛЮБАВА,
кандыдат філалагічных навук.

Шчастлівага Вам жыцця!

Зусім нядауна у адным з шматкватэрных дамоу рабочага пасёлка аутазаводцаў адзвінела вяселле.

Тосты узнімалі за усё: і за шчасце маладажонау, і за іх радаснае будучае, і яшчэ за тое, каб Марыя Валчок, студэнтка V курса аддзялення рускай мовы і літаратуры нашага універсітэта, паспяхова здала экзамены.

Ад усяго сэрца віншавалі са шлюбам рабочага мінскага падшыпнікавага завода Юлія Масленнікава і Марыю Валчок яе сяброукі-аднакурсніцы Крысціна Сцепановіч, Марыя Забежынская і Зінаіда Гарбачова.

Яшчэ адна сям'я узнікла у Мінску. Хочацца спадзявацца, што яна будзе дружнай і шчаслівай. І яшчэ хочацца пажадаць маладажонам, як пішуць у пісьмах, усяго найлепшага ў працы, вучобе, асабістым жыцці.

М. ПІЛЬШЧЫКАЎ.

Пытайся—адказваем

Таварышы

Мядзведзева, Неменман, Межэнь, Вінцэвіч!

У адказ на Ваша пісьмо мы змяшчаем артыкул

„Правописание гласных в новом орфографическом своде“

НОВЫЕ «Правила русской орфографии и пунктуации» открываются большим разделом, посвященным правописанию гласных.

Остановимся более подробно на некоторых из тех правил этого раздела, которые в новом своде заметно изменились по сравнению с существовавшими до сих пор орфографическими нормами.

Уточнены и улучшены правила написания гласных после шипящих и Ц. Так, например, расширен круг слов, в которых пишется слог ЦИ. По старому правилу написание И или Ы после Ц зависело от происхождения слова: является ли оно русским или иноязычным. В русских словах следовало писать Ы, а в заимствованных—И.

Новые правила сохраняют Ы после Ц только в нескольких отдельных словах: (ЦЫГАН, ЦЫПЛЕНОК, НА ЦЫПОЧКИ, ЦЫЦ). Во всех же остальных случаях (кроме окончаний и суффиксов) новое правило требует написания после Ц буквы И (ЦИФРА, ЦИБИК, ЦИНОВКА, ЦИМБАЛЫ, ЦИНК, МЕДИЦИНА и др.).

Много колеблющихся написаний было в сочетании шипящих с буквами О, Е и Ё.

В течение последних лет были урегулированы написания букв О и Е после шипящих в окончаниях и суффиксах. В именах существительных и прилагательных в этих частях слова писалось под ударением О, в глаголах и отглагольных образованиях — Ё (ВРАЧОМ — ПЛАЧЕМ, САРАНЧОЙ—ТУЧЕЙ, ГАЛЧОНОК—МОЧЁНЫЙ).

Хуже дело обстояло с буквами О, Ё и Ё в корнях слов. Сплошь и рядом приходилось выбирать один из двух различных вариантов написания того или иного слова: ЖОЛУДЬ—ЖЁЛУДЬ, ЖОЛОБ—ЖЁЛОБ, ЧОРТ—ЧЁРТ, ТРУЩОБА—ТРУЩЁБА.

Новыми правилами об обозначении звука О в основах слов после шипящих под ударением устанавливается строгая последовательность: в тех случаях, когда звук О чередуется со звуком Е в других формах или в других словах того же корня, следует писать букву Е, при отсутствии такого чередования следует писать букву О. Это означает, что нужно писать ЖЕЛТЫЙ (ср. ЖЕЛТЕТЬ), ШЕПОТ (ср. ШЕПТАТЬ), но: ОБЖОРА, КРЫЖОВНИК, ТРУЩОБА, ШОВ, ЧОКАТЬСЯ и т. п.

Упорядочено в новом своде употребление буквы Ы после приставок, оканчивающихся на согласный. По прежним правилам эти написания зависели от основы слова: если приставка присоединялась к русской основе, начальная буква И основы заменялась буквой Ы (ИСКАТЬ—ОТЫСКАТЬ), если же основа была иноязычной—такая замена не производилась (ИНТЕРЕСНЫЙ — БЕЗИНТЕРЕСНЫЙ, ИДЕЙНЫЙ—БЕЗИДЕЙНЫЙ).

Новое правило сформулировано так:

«При сочетании приставки, оканчивающейся на согласный, с корнем или с другой приставкой, которые начинаются с И, пишется согласно с произношением, по общему правилу Ы (подчеркнуто нами—Б. К.), например, РОЗЫСК, ПРЕДЫДУЩИЙ, ВОЗЫМЕТЬ, ИЗЫМАТЬ (но ВЗИМАТЬ, где произносится И), ПОДЫТОЖИТЬ, БЕЗЫСКУССВЕННЫЙ, СЫЗНОВА, БЕЗЫДЕЙНЫЙ, БЕЗЫНИЦИАТИВНЫЙ...»

Некоторым кажется непривычным новый облик слов типа БЕЗЫДЕЙНЫЙ, БЕЗЫНТЕРЕСНЫЙ и т. д. Но ведь привычка дело весьма относительное, а зато новыми правилами устраняется разнобой в существующей практике, написания типа БЕЗЫДЕЙНЫЙ становятся в один ряд с такими привычными написаниями, как ВОЗЫМЕТЬ, ПОДЫТОЖИТЬ, ПРЕДЫДУЩИЙ и мн. др.

Очень серьезная поправка вносится в новом своде одним из пунктов правила об употреблении буквы Э. Мы имеем в виду пункт которым устанавливается написание во всех случаях буквы Е (а не Э) после И внутри слова. Этим устраняется двойственность в написании многих слов: ДИЭТА—ДИЕТА, ПИЭМИЯ — ПИЕМИЯ, ПИЭТЕТ—ПИЕТЕТ (почтительное отношение к кому-либо, чему либо), ДИЭЗ—ДИЕЗ. Характерно, что в других словах такого же типа писалось только Е: ГИЕНА, ГИГИЕНА, РЕКВИЕМ, КЛИЕНТ, ПАЦИЕНТ, КОЭФФИЦИЕНТ и подобных.

Теперь, как уже говорилось, этот разнобой устранен, мы будем писать только Ё в таких случаях: ДИЕЗ, ПИЕТЕТ, ПИЕМИЯ и т. д.

Хорошо и просто в новом своде решен вопрос с написанием буквы Ё. Как известно, считалось если не необходимым, то во всяком случае очень желательным писать букву Ё во всех случаях, когда произносится ударяемый звук О после мягких согласных и после шипящих (НЁС ПЛЁТКА, ПЁТР, ШЁЛ, СЧЁТ и т. п.)»

В новых правилах предусматривается употребление буквы Ё только в тех случаях, где она действительно необходима. Например, буква Ё иногда помогает различить слова, в которых произносится ударяемый звук, О, а не Е (УЗНАЁМ в отличие от УЗНАЕМ, ВСЁ в отличие от ВСЕ. В ряде случаев буква Ё облегчает произношение малознакомого слова, например: ОЛЁКМА (река), фамилии БОКАРЁВ, ЛИХАРЁВ, СКЛЕЗНЁВ и мн. др.

В небольшой статье не представляется возможным охарактеризовать все правила написания гласных, приведенные в новом своде. Но мы надеемся, что читатель уловил главное: новый свод правил русской орфографии и пунктуации еще более укрепляет нашу орфографическую систему—важнейшее культурное достояние народов нашей великой страны.

Б. КОСОВСКИЙ,
доцент.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, 62, тэл. 2-07-19

Рэдактар А. ВОЛК.

АТ 10522 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 34 Тыраж 2000